# ЮБІЛЕЙНЫЯ ДАТЫ

## ПАЭТ-ПАТРЫЁТ, ПАЭТ-ВОІН
## (да 95-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова)

Пад патрыятызмам разумееца "маральны і палітычны прынцып, змест якога – любоў да ўсяго айчыннага, ад мясцовасці, дзе чалавек нарадзіўся, яго народа, мовы, культуры, і да дзяржавы, грамадзянінам якой ён з'яўляецца" [1, с 183]. З прыведзенай вышэй дэфініцыі паняцця "патрыятызм" вынікае, што патрыёт – гэта чалавек, які беззапаветна любіць сваю родную зямлю, які не ўяўляе жыцця без яе, які гатовы бараніць яе "штыком і пяром". Менавіта такім і быў народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў.

Нарадзіўся Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў 6 лютага 1914 г. у вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Схільнасць да літаратурнай творчасці ў Куляшова выявілася вельмі рана – яшчэ да школы, прычым, як некалі і Якуб Колас, свае першыя вершы будучы народны паэт пісаў на рускай мове. 30 верасня 1926 г. у Клімавіцкай акружной газеце "Наш працаўнік" быў надрукаваны верш Куляшова "Ты, мой брат". З гэтага першага верша на працягу больш паўстагоддзя паэт услаўляў свой родны край, сваю бацькаўшчыну. У наступныя гады творы Аркадзя Куляшова ўсё часцей з'яўляюцца ў раённым, абласным і рэспубліканскім друку.

У 1930 г. у Мінску выходзіць першы зборнік вершаў Куляшова "Росквіт зямлі", а праз два гады – яшчэ дзве кнігі: "Па песню, па сонца!.." і "Медзі дождж". Здзіўляе глыбіня думак паэзіі яшчэ зусім "зялёнага" юнака, якому і дваццаці год няма. Было відаць, што ў літаратуру прыйшоў таленавіты, неардынарны паэт са сваім непаўторным успрыманнем жыцця і свайго месца ў гэтым жыцці.

Большасць вершаў названых вышэй кніг напісана пад непасрэдным уплывам тых падзей, што адбываліся на Беларусі, – калектывізацыя і гады першых пяцігодак. Ужо ў пасляваенны час Куляшоў успамінаў: "Займаючыся ў інстытуце (Мінскім педагагічным (1931 – 1933). – А.Л.), не парываю сувязей з вёскай, летнія канікулы праводжу ў родных краях, у асяроддзі сяброў дзяцінства, на калгасных станах, сярод трактарыстаў, брыгадзіраў і звеннявых. З жывой цікавасцю сачу за новым жыццём вёскі, за тымі пераўтварэннямі, якія з году ў год усё больш мяняюць яе былое аблічча" [2, с. 7]. Лірычны герой Куляшова шчыра вітае ўсё новае, што адбываецца ў жыцці беларускай вёскі:

*Сябры! У будаўнічых рашучых паходах,*
*Дзе сэрцы палаюць любімай зарой,*
*На карце вялікіх жывых пяцігодак*
*Мы творчыя справы акрэслім мяжой.*

У гэтых радках адчуваецца дынамізм часу, у якім жыў аўтар, выяўляецца радасць юнацкіх пачуццяў і рамантызм маладога пакалення і самога паэта.

Не па-юнацку стала разважае Куляшоў аб каханні ў вершы "Бывай...", калі паэту было толькі чатырнаццаць год:

*Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся,*
*Бывай, смуглявая, каханая, бывай.*
*Стаю на ростанях былых, а з паднябесся*
*Самотным жаўранкам звініць і плача май.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Глыбокая лірыка і пяшчота, летуценне і лёгкі сум выяўляецца ў гэтых радках. Невыпадкова наш славуты кампазітар Ігар Лучанок напісаў музыку на словы верша “Бывай...” і нарадзілася знакамітая песня “Алеся”.

Пра каханне, пра сустрэчы і ростані, пра мары і летуценні свайго пакалення мы знаходзім у больш позніх творах Куляшова. Вершы “Ельнік”, “Бюро даведак”, “На сотай вярсце”, “Карусель” і іншыя склалі цыкл “Юнацкі свет”. Выкарыстоўваючы разнастайныя вобразныя сродкі, Куляшоў у вершах гэтага цыкла дасягае шырокага паэтычнага абагульнення. Яго асабістае ўспрыняцце свету з’яўляецца адлюстраваннем свету цэлага пакалення і арганічна ўпісваецца ў свет агульнанароднага жыцця. Свет яго лірычнага героя адкрыты дабру і сонцу, каханню і маладосці, сацыяльнай роўнасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні:

*Паўз хату вашу ў поплаў ходзяць цені,*
*Ім трэба, мусіць, слухаць салаўя.*
*Ад вокнаў электрычнасць на бярвенні...*
*У вас такая ж хатка,*
*Як мая.*
*Заходзь жа ў хатку, родная дзяўчынка,*
*Мой клопат тут, мой журавінны мох!*
*На нас, як пераступіш ты парог,*
*Вясёлым вокам гляне журавінка.*

Куляшоў з усё большай адказнасцю разважае аб сваёй творчасці і яе ролі ў жыцці грамадства. Вынікам гэтага роздуму з’явіліся такія вершы, як “Магілёўская хмарка” і “Плыла, цалавалася хмара з зямлёй...”. У першым вершы хмарка – гэта жывая істота. Яна паспагадала жнеям і схавала іх у свой цень ад невыносна гарачага сонца, прывяла ў рух вятрак, чым таксама прынесла карысць людзям. Праз пейзажны малюнак паэт выказаў духоўна глыбокую думку:

*І людзі ўсміхаюцца хмарцы сваёй,*
*І ўдзячны*
*Услед ёй крычу я:*
*– Расці, магілёўская хмарка,*
*З зямлёй*
*Трымаючы сувязь жывую!*

У другім вершы – “Плыла, цалавалася хмара з зямлёй...” – Аркадзь Куляшоў выказвае свой погляд на асобу паэта:

*Хачу неспакойнаю хмарай грымець,*
*Маланкамі ўвесь апавіты,*
*Каб цяжка адразу было зразумець*
*Ці вокам акінуць, які ты.*

Тэма паэта і паэзіі знаходзіць свой працяг у вершы “Мая Бесядзь”. У аснову верша лягло народнае паданне аб тым, што “рэкі птушкамі створаны”. Птушкі, як і людзі, у пераважнай большасці вялікія працаўнікі. І калі ўсе пярнатыя шчыравалі, капючы рэчышча, адна каня не працавала ды яшчэ і насміхалася з нястомных працаўнікоў. Птушкі праклялі каню і не дазволілі піць ваду з рэк. З той пары лятае каня над рэкамі і просіць піць, канаючы ад смагі. Лірычны герой Куляшова не хоча нагадваць каню, ён ставіць сябе на месца самаадданых птушак-працаўніц і капае “рэчышча ўласнай ракі”:

*Я ўпарты, не кіну пачатае справы,*
*Каменне крышу,*
*Разграбаю пяскі,*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Пад кпіны аматараў лёгкае славы*
*Капаю рэчышча ўласнай ракі.*

Аўтар цешыць сябе надзеяй, што "спатканая крыніца разальецца ракой". І няхай гэтая рака будзе "не Волга магутная і нават не Кама", а ўсяго толькі маленькая Бесядзь, "што на радзіме маёй", але гэта будзе свой след, пракладзены ўпартай працай:

*Бо прагай да працы ахоплены часта я*
*І сэрца абпалена смагай радка,*
*Бо жыць не магу я,*
*Як каня няшчасная,*
*Кропляй дажджу з лесавога ліста.*

Талент паэта найбольш ярка праявіўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Куляшоў добраахвотна ўступае ў рады Чырвонай Арміі, праходзіць курсы ваеннай падрыхтоўкі і накіроўваецца ў армейскую газету "Знамя Советов".

Адступленне нашых войск, жорсткія налёты фашысцкай авіяцыі, разбурэнні і шматлікія чалавечыя ахвяры – усё гэта ўразіла душу паэта сваім трагізмам і не магло не выліцца ў ягонай паэзіі. Выдатнымі ўзорамі патрыятычнай лірыкі гэтай пары з'яўляецца паэма "Сцяг брыгады" і вершы "Ліст з палону", "Над брацкай магілай", "Балада аб чатырох заложніках" і інш.

Паэма "Сцяг брыгады" была напісана "на адным дыханні" – у верасні-кастрычніку 1942 г. Сюжэт паэмы распавядае аб тым, як трое байцоў выносяць з акружэння сцяг брыгады. Форма паэтычнага дзённіка (пра падзеі расказвае беларускі воін Алесь Рыбка) дазволіла аўтару больш шырока выкарыстоўваць паэтычную ўмоўнасць. Паэма пачынаецца са сцэны развітання галоўнага героя з родным горадам:

*Як ад роднай галінкі дубовы лісток адарваны,*
*Родны Мінск я пакінуў, нямецкай бамбёжкаю гнаны.*
*Міма дрэў, міма дрэў*
*Усю ноч я ішоў, – за спіною*
*Родны горад гарэў,*
*І не ведала сэрца спакою...*

Драматызм і напружанасць абстаноўкі ўзмацняецца ў паказе развітання героя з родным горадам, які жудаснымі водбліскамі пажарышчаў асвятляе галоўнаму герою паэмы шлях на ўсход – да сваіх. І хаця дзеянне твора храналагічна ахоплівае толькі пачатак вайны і да перамогі над ворагам вельмі далёка, герой свята верыць у вызваленне Радзімы:

*Я табе абяцаю і попелам родным клянуся,*
*Што з дарогі ўначы не саб'юся,*
*Вярнуся, вярнуся!..*

Паэма шматгранна раскрыла выключны драматызм усенароднай барацьбы з ворагам і разам з тым выключны гераізм беларускага народа ў непрымірымым змаганні з фашысцкай навалай. Канцоўка твора жыццесцвярджальная і аптымістычная:

*Хто сказаў, што брыгады не стала,*
*Што забіты таварышы ўсе?..*
*Вось яны – дарагія,*
*Маладыя, суровыя,*
*Гарадскія, вясковыя, –*
*Да акопаў белою хмарай*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Набліжаюцца дзецюкі;*
*Хутка,*
*Хутка па ворагу ўдараць*
*Гартаваныя іх штыкі.*

Верш "Ліст з палону" напісаны ад імя дзяўчыны-паланянкі, якую фашысты вывезлі ў няволю, адарваўшы ад родных ніў, ад блізкіх людзей, асудзілі на здзекі і пакуты. У маналогу дзяўчыны чуецца боль усёй зняволенай Беларусі:

*Я рабыня, рабыня,*
*Я чорная, чорная, чорная,*
*Любы мой, не з табой,*
*А з праклятай бядой*
*Заручоная...*
*Я пішу, я прашу:*
*Ты прыйдзі, ты адпомсці, мой мілы,*
*Не прашу за сябе, –*
*За зямлю, што нас лёгка насіла.*

Верш заканчваецца наказам, які гучыць як загад:

*Ліст ад сэрца ўсяго*
*Паланёная склала дзяўчына,*
*Ты чытай і адказ на яго*
*На штыку данясі да Берліна.*

Эпізод суровага франтавога жыцця ўзнаўляе Аркадзь Куляшоў у вершы "Над брацкай магілай", дзе распавядаецца аб пахаванні беларускіх воінаў, што загінулі ў бітве з ворагам за рускую вёску Лажыны. Драматызм верша не толькі ў тым, што маладыя хлопцы загінулі, прычым далёка ад роднай зямлі, але і ў тым, што "просяць іх вочы хоць жменьку палескага жвіру". Але дзе яго ўзяць: родная зямля захоплена ненавісным ворагам. А яны, адыходзячы з дому, не бралі ў дарогу мяшэчкаў з роднай зямлёй:

*Што ім жменька зямлі той?*
*Ты ўся ім патрэбна, радзіма,*
*А ў дарожным мяшэчку*
*Умясціць цябе ўсю немагчыма.*
*Паспрабуй у дарогу забраць*
*Тыя пожні, палі і крыніцы,*
*Тыя пушчы, што могуць*
*Хіба толькі ў сэрцы ўмясціцца.*

Глыбокім патрыятызмам прасякнуты апошнія радкі верша. Тут голас паэта ўзвышаецца да публіцыстычна-пафаснай прамовы:

*Беларусь, мая родная,*
*Як жа я рвуся яшчэ раз*
*Пеша ўсю цябе змераць,*
*Увесь і чабор твой, і верас!..*
*Сэрца просіць шляхоў,*
*Што цяжкім маім ботам пад сілу;*
*Наглытацца хачу туманоў,*
*Твайго ветру і пылу;*
*Наглытацца хачу за сябе і за тых,*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Што не ўстануць з нябыту;*
*Вочы просяць нябёсаў тваіх,*
*Ім твайго не хапае блакіту.*

Адным з самых драматычных вершаў аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца "Балада аб чатырох заложніках". У аснове верша рэальныя падзеі: фашысты ўзялі дзяцей і сястру партызанскага камандзіра – бацькі Міная. Верш напісаны з такой сілай, што і сёння, праз шэсць дзесяцігоддзяў, хвалюе нас да глыбіні душы, нібы тая крывавая драма адбылася на нашых вачах.

Балада пачынаецца стрымана. Па жытняй сцяжынцы фашысты гоняць жанчыну і дзяцей. Ворагі пасадзілі заложнікаў у падвал і ставяць умову: калі партызанскі камандзір не здасца, заложнікі будуць расстраляны.

Праклёнам фашызму гучаць, здавалася б, наіўныя пытанні трохгадовага хлопчыка:

*– А чаму нас вартуюць салдаты? –*
*Знаць маленькаму хлопчыку трэба. –*
*А чаму не пускаюць за краты,*
*За якімі і сонца, і неба?*
*А ці скора нас вызваліць татка?*

Паэт ставіць словы ў такія сувязі, што яны выклікаюць шмат думак. Мы думаем і пра мужнасць бацькі Міная, які не прыйдзе да ворага, бо "на гэта ён не мае бацькоўскага права". Мы думаем пра звярынае аблічча фашыстаў, якія ваююць нават з дзецьмі. Мы думаем і пра таго савецкага салдата, які, ахвяруючы сваім жыццём, выратаваў нямецкую дзяўчынку ў час бою з фашыстамі на нямецкай зямлі ў далёкім 1945-м. А ў 1942 г. на беларускай зямлі адбываецца трагедыя. Салдат да сцяны прыстаўляе "ворагаў" – беларускіх дзяцей. Цэліць у льняныя галовы.

*...Пачынае*
*З сына Міная.*
*Стрэл.*
*Упаў хлапчук трохгадовы...*
*Кат ізноў пісталет узнімае...*
*На сцяне – заложнікаў цені...*

Сцэна расстрэлу намалявана паэтам знарок скупа. Перад намі за скупымі словамі – боль, гора і гнеў самога паэта. Ён на момант змаўкае перад трыма апошнімі радкамі. І гэтыя радкі, сказаныя нібы шэптам, крычаць на ўвесь свет:

*Вось і ўсё.*
*Перад бацькам Мінаем*
*Станьце ўсе бацькі на калені!*

І ў пасляваенны час Аркадзь Куляшоў сваёй творчасцю ўслаўляе родны край, працавіты беларускі народ. Ён, як і раней, паэт-патрыёт, паэт-воін, чалавек, які адчувае асабістую адказнасць за лёс не толькі сваёй радзімы, але і ўсяго чалавецтва.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1996 – 2004. – Т. 12. – С. 183.
2. ***Бярозкін, Р.*** Аркадзь Куляшоў: нарыс жыцця і творчасці / Р. Бярозкін. – Мінск, 1978. – 216 с.
3. ***Мішчанчук, М.І.*** Ёсць у паэта свой аблог цалінны: жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі / М.І. Мішчанчук. – Мінск, 1992. – 315 с.

*А.С. ЛАЎШУК, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова